# “ДАМОЎ Я ВЯРНУЛАСЯ 9 МАЯ”

## З успамінаў Н. С. Кулікоўскай, жыхаркі вёскі Старынцы.



*Н.С.Кулікоўская*

У Надзеі Сцяпанаўны свае ўспаміны пра вайну. Яны скупыя, але такія вобразныя, што з іх складваюцца цэласныя жывыя карцінкі.

**Эпізод першы**

… Восень. Бацька малоціць у гумне снапы. Бачыць, у бок гумна ідзе вясковы стараста Васіль Вішнеўскі. Павітаўся і кажа:

– Збірай усё ж, Сцяпан, сваю старэйшую дачку ў Германію. А не – дык усю сям’ю, сказалі, забяруць. Ты не крыўдуй, Іван, я тут ні пры чым… Татка прыйшоў дахаты белы як мел.

Маці – да яго:

– Што, Іван, здарылася? Чаго Васіль да цябе прыходзіў?

– Нават не ведаю, як вам і сказаць…, – татка ўздыхнуў і выцер рукавом мокрыя вочы. – Надзю забіраюць ў Нямеччыну…

Хата напоўнілася плачам. Маці галосіць сабе, мае малодшыя сястрычкі Зіна і Шура – сабе, дзяўчаткі абдымаюць, цалуюць мяне.

…І вось бацька вязе мяне на возе ў пастарунак у Бераставіцу. Ужо ў лес уехалі, а я ўсё яшчэ бачу на дарозе постаці сястрычак, якія доўга беглі за возам. На душы так маркотна і гаротна, такі скоўвае страх перад невядомасцю, што плачу, не сціхаючы. Тая дарога да Бераставіцы на ўсё жыццё ў памяць і сэрца ўрэзалася.

На тую пару ў Нямеччыну з нашай вёскі былі ўжо забраны Наталля Акуліч, Вера Маржэвіч, Міша Мелянец, Зіна Лазарчык, Мікалай Міхальчук. А цяпер толькі мне адной загад такі выйшаў.

**Эпізод другі**

У Беластоку моладдзю цэлы цягнік біткам запоўнілі. За ноч мы заехалі ў горад Тыльзіт (Усходняя Прусія. Цяпер – Калінінградская вобласць г. Баграціёнск). Там усіх размеркавалі па гаспадарах. Я трапіла да багатых: многа зямлі, вялізная хата, кароўнік, свінарнік – усе

пабудовы дабротныя, на вякі. Аж злосць мяне ўзяла: “ Чаго ж гэта, – думаю, – вам не хапала, што на ўвесь свет вайною пайшлі?! Жылі б сабе, рабілі б на сваёй зямлі”.

Прыставілі мяне карміць свіней: штодня варыла і таўкла буракі, сырыя здрабняла. Летам траву касілі і падвозілі. Работы не баялася, яе і дома ў таткі хапала. Але так крыўдна было рабом быць! Любы немец, нават не твой гаспадар, мог накрычаць, прыгразіць.

… За шашою – бульбяное поле. Паляк Владэк араў, а я ўслед накідала бульбу ў баразну. Раптам лінуў дождж. Мы – хутчэй пад дрэва. І тут чуем:

– Шнэль! Шнэль!

Нейкі гаспадар з вёскі злосна тупае на дарозе нагамі і махае нам, загадвае, каб ішлі рабіць. Я потым ўсё лета кашляла.

… Да гэтай пары ў вачах стаіць, як наша армія Інстэнбург бамбіла. Чырвонае зарава і дым стаялі ва ўсё неба. Самалёты разварочваюцца і зноў ляцяць бамбіць проста над намі – парабак касіў касяркай, а я за ёй траву збірала. Так, паверце, страшна было! Але ісці з поля не мелі права.

**Эпізод трэці**

Праз дзень-два немцы пачалі адступаць. Нас таксама вывезлі – капаць акопы пад Кёнігсбергам. Крушня не крушня, гліна не гліна, а норму выканай. Есці давалі кавалачак хлеба і халодную гарбату, спалі покатам на саломе ў гумне – ад холаду зуб на зуб не трапляў. Там я і застудзіла калена, далягае ўсё жыццё. Ведалі: нас збіраюцца гнаць да Балтыйскага мора і грузіць на баржы. Але аднойчы прачнуліся ранкам, а ўсюды – цішыня. Немцы, высветлілася, ўцяклі.

Мы пабрылі куды вочы глядзяць. У нейкай вёсцы каля самай чыгункі, дзе стаяў разбіты поезд з вопраткай, зайшлі з сяброўкамі ў адну з хат. Гаспадароў няма, а пліта яшчэ гарачая. Схадзілі да поезда. Ідзем назад і радуемся: во як цёпла прыадзеліся! Адна дзяўчына кажа:

– Пабеглі хутчэй! Бульбы можа знойдзем, то зварым. Толькі забеглі ў сенцы, як над дахам прасвістаў снарад і разарваўся якраз у тым месцы, дзе мы толькі што ішлі…

Потым не раз яшчэ і пад абстрэл, і пад бамбёжку трапляла. Але шанцавала, не кантузіла нават.

Ад шчасця, калі напаткалі нашых салдат, плакалі. Хлопцаў, рускіх і беларусаў, адразу афармлялі на фронт, а нас, восемдзесят дзяўчат, прыставілі да пральні. Тры месяцы адзенне для байцоў мылі і сушылі. У свае Старынцы я дабралася 9 мая. Толькі ніхто ў вёсцы тады яшчэ не ведаў, што дзень гэты ўвойдзе ў гісторыю як Дзень Перамогі.

Марыя Драпеза, 2015 год.